**Тэма:** Звонкія і глухія, шыпячыя і свісцячыя зычныя гукі.
**Мэта**: Фарміраваць у вучняў уменні адрозніваць звонкія ад глухіх, свісцячых ад шыпячых; развіваць уменні правільнага вымаўлення звонкіх перад глухімі, глухіх перад звонкімі,свісцячых перад шыпячымі і наадварот;выхрўваць культуру моўных зносін на ўроку.

**Ход урока.**

**1.Арганізацыйны момант.**

На карце вялікага свету
Яна, як зялёны лісток,
Песня гарачага лета,
Крынічнай вады глыток.
Адвечная калыханка,
Душы запаветны куток.
В. Вітка

-Аб чым гаворыць В.Вітка ў вершаваных радках? (аб Беларусі)
-Як вы здагадаліся? (на геаграфічнай карце абрысы яе тэрыторыі нагадваюць зялёны кляновы лісточак)
-Які сэнс мае спалучэнне слоў “адвечная калыханка”? (тут матулі спявалі сваім маленькім дзецям песні (калыханкі) з той мэтай, каб яны хутчэй засыпалі; гэтыя песні запаміналіся на доўгія часы).
-Чаму Беларусь, лічыць паэт, - душы запаветны куток? (выказвае свае адносіны да Беларусі, якая з’яўляецца для яго родным куточкам, таму што ён тут нарадзіўся, вырас, пасталеў, адчуў смак крынічнай вады ...)
-Ці задаволены вы тым, што нарадзіліся і жывяце ў Беларусі?
-Што вас радуе, а, можа, нешта засмучае? (выказванні вучняў).
**2.Праверка дамашняга задання.**
*А).Запісванне вучнем на дошцы апорнай схемы на правапіс іе (ые), ія (ыя), іё (ыё)*
*Б). Прывядзенне прыкладаў.*
*Г). Пр.93*
**3. Новы матэрыял.**
1.Разгляд “елачкі” па фанетыцы
-Давайце успомнім, як называюцца гукі, якія вымаўляюцца пры дапамозе голасу і шуму? Так, звонкія. Знойдзем на галінцы елачкі звонкія зычныя і назавём іх.
- Як называюцца гукі, якія вымаўляюцца толькі з дапамогай шуму? Так, звонкія.
- Знойдзем на галінцы елачкі глухія зычныя.
- Адзіночныя звонкія; адзіночныя глухія.
- Знойдзем шыпячыя. Колькі іх? Назавіце.
- Знойдзем свісцячыя гукі. Колькі іх? Назавіце
**4.Замацаванне**

*1. Слоўнікавая работа.*
Пісьмо пад дыктоўку на дошцы і ў сшытках.
Жыта, шыта, джала, чорны, зіма, снег, цень, рэзкі, просьба, касьба, дзядзька, возчык, рэзчык.
-Падкрэсліце шыпячыя адной рыскай, а свісцячыя–дзвюма.
*2.Зачытванне правіла па кнізе пра звонкія, глухія, шыпячыя і свісцячыя гукі.*
*3.Работа над практыкаваннямі 97, 98. Вывад вымаўлення шыпячых і свісцячых гукаў.*
**5. Самастойная работа.**
1.З арфагарафічнага слоўніка высаць 8 слоў, уякіх ёсць шыпячыя (3-ты ўзровень); 10 слоў, у якіх ёсць свісцячыя (4-ты ўзровень); 7 слоў, у якіх ёсць звонкія і 7 слоў, у якіх ёсць глухія (5-ты ўзровень)
2. Давійце ўспомнім, як праверыць напісанне звонкіх і глухіх зычных на канцы і ў сярэдзіне слова? Прывядзіце свае прыклады. Запомніце верш.
Калі ў слове зычны чуеш невыразна,
Слова хутка ты змяняй,
Ды зычнага галосны падстаўляй,
Год–гадамі правярай.
**3.Работа па картцы.**

**6.**
**7.**
**8.**

*Уставіць прапушчаныя літары.*

Адышлі чарніцы, выбралі суніцы,
Перастала ры..ка, брацца на кручок.
Ідуць у бруснічнік дзеўкі, маладзіцы,
А Міхася цягне бор і хвайнячок.
Добры бор сасновы падарунак новы:
Сталі паяўля..а па лясах гры..кі,
Ды ці знойдзеш словы апісаць іх сховы–
Апісаць даро..кі, дзе хадзілі но..кі
Гры..нікоў заўзятых. Ну а нам Міхась?
Пачакайце тро..кі, абмінем паро..кі–
Грэблі, раўчавіны, і пяскі, і гра..ь.

*Чаму некаторыя гукі абазначаюцца іншымі літарамі?*

(Урок беларускай мовы ў 5 “Б” класе)

**Падрыхтавала**

**настаўнік**

**Шыманчык Г.М.**

**Івацэвічы 2023**